УДК: 61:615.1(043.2)
ББК: 5:52.82
А 43
ISBN: 978-985-21-0765-5



***Вароніна Я. О., Кохан А. І.***

# НЯМЕЦКАЯ ПРАПАГАНДА НА БЕЛАРУСІ Ў 1941–1944 ГГ.

***Навуковы кіраўнік: канд. гіст. навук, выч. Масейчук Л. І.***
*Кафедра філасофіі і паліталогіі*
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі універсітэт, г. Мінск*

Галоўнымі мэтамі нямецкай улады з’яўляліся поўнае падпарадкаванне і эксплутаванне насельніцтва акупаванных тэрыторый. Абок з рэпрэсіўнымі захадамі, такімі як прымус да працы, расстрэл, тэррор і забойствы актыўна выкарыстоўвалась прапаганда. Фарміраванню ў вачах мірнага населніцтва вобраза нямецкага салдата як збавіцеля актыўна садзейнічалі нямецкія прапагандысты, падрыхтоўка якіх вялася пад наглядам Вермахта.

У залежнасці ад таго з якім сацыяльным слоем насельніцтва праводзілася ідэалагічная праца, нямецкія прапагандысты выкарыстоўвалі розныя сродкі: плакаты, газеты, радыё і фільмы. Так пры правядзенні прапаганды сярод салдат Чырвонай Арміі і партызан найбольш дзейным сродкам былі прызнаны лістоўкі. Для іх распаўсюджвання ўжываліся агітацыйныя бомбы, снарады, рэактыўныя міны, самалёты. Яны былі невялікага памеру, каб іх было зручней раскідываць з самалётаў, прасцей падняць з зямлі і, непрыкметна ад вачэй паліткамісараў, пакласці ў кішэню. На лістоўках часцяком ілюстравалі немца як вызваліцеля, пісалі розныя лозунгі і заклікі, як правіла, на беларускай мове, што з’яўлялася важлівым прынцыпам прапаганды.

Асаблівую ўвагу нямецкія прапагандысты надавалі такой сацыяльнай группе як рабочыя і сяляне. У прапагандыскіх лістоўках да насельніцтва гаварылася: “Германія не патрабуе ад беларусаў цела і жыцця, Германіі патрэбны рабочыя! Прамысловыя, сельскагаспадарчыя, рамеснікі, аднак і неадукаваныя рабочыя знойдуць у Германіі лепшыя ўмовы працы і харчавання, чым дома”. Па сутнасці рыторыка агітацыйных плакатаў зводзілася да наступнага: “Беларускія сяляне! Пастаўляйце рабочых для высечкі лясоў, здабычы торфу, выконвайце вашы заданні пры транспарціроўцы гэтых прадуктаў”

У імкненні раз’яднаць насельніцтва Беларусі на як мага большую колькасць частак, прапаганда ўсё больш падкрэслівала на захопленых тэрыторыях нацыянальныя адметнасці. У гэтым накірунку адным з асноўных пунктаў нямецкай прапаганды з’яўлялся ***антысемітызм.*** У прапагандзе, якая была накіравана на насельніцтва Беларусі, ён адыгрывал рашучую роль.

Існавала яшчэ адзін напрамак нямецкай прапаганды, яеі быў шырока распаўсюджаны на беларускіх тэрыторыях падчас Вялікай Айчыннай вайны – **антыкамуністычная прапаганда**. Шматлікія агіатцыйныя сродкі пазіцыяніравалі нямцкіх саладтаў быццам вызваліцеляў Беларусі ад “бальшавіцкага ярма”, ад галоўнага ворага пражываючых тут людзей - савецкага грамадскага ладу. Такая прапаганда замацоўвалась жорсткай заканадаўчай базай.

Прапаганда рэзка кантрасціравала з рэчаіснасцю. Гвалт, забойствы, ігнараванне простых чалавечых правоў і безнаказаннасць рабаўнікоў спрыяла пашырэнню партызанскай і падпольнай барацьбы. Нягледзячы на масавы тэрор, барацьба партызан карысталася значнай папулярнасцю і падтрымлівалася большасцю насельніцтва. Таму раводзілася сур'ёзная праца па папярэджанні падтрымкі партызанскага руху. Немцкія ідэолагі актыўна распачалі новы накірунак прапагандысцкай вайны. У сваіх закліках да насельніцтва ўзводзілі паклёп на партызан, якіх яны называлі не інакш як бандытамі, а партызанскі рух вызначалі як **“бандытызм”.** Пры чым да бандытаў былі далучаны не толькі самі партызаны але і цэлы пласты насельнцтва, што жылі на Беларусі.